■ Успамінаючы Рыа

# ЁСЦЬ МЭТА — БУДЗЕ ПОСПЕХ

**Марыя МАМАШУК гаворыць, што дагэтуль да канца не ўсведамляе каштоўнасць сваёй сярэбранай перамогі на Алімпійскіх гульнях у Рыа-дэ-Жанэйра.**



Фота Уладзіміра СТУПІНСКАГА

**Марыя Мамашук. Майстар спорту міжнароднага класа па вольнай барацьбе. Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў, чэмпіёнка Еўропы, чэмпіёнка Еўропы сярод моладзі, бронзавы прызёр Еўрапейскіх гульняў.**
**Другое месца на Алімпійскіх гульнях — 2016 у вагавай катэгорыі да 63 кг.**
**BYN10 тысяч ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Марыя пералічыла для выхавання новага пакалення таленавітых майстроў барацьбы ў СДЮШАР першаснай арганізацыі прафсаюзаў Гомельскага вагонабудаўнічага завода. Менавіта ў ёй яна рабіла свае першыя крокі да сярэбранага алімпійскага медаля.**

— Чым больш абдымаюць, віншуюць і жадаюць разам сфатаграфавацца, тым больш асэнсоўваю, што ў мяне ёсць медаль і ён чагосьці варты, — кажа цяпер яна.

...Маша была нацэлена толькі на «золата». І «серабро» палічыла паражэннем. Таму на ўсіх здымках са сталіцы сёлетняй Алімпіяды яна такая сумная. Але ж суайчыннікі разумеюць сапраўдную вагу сярэбранага медаля на галоўных сусветных спартыўных спаборніцтвах. Наша Маша — самая лепшая, самая моцная і самая ўпартая, упэўнены беларусы. Пакуль мы разам ідзём у Гомельскі абласны драматычны тэатр, у памяшканні якога будзем гутарыць з Марыяй, яе пазнаюць, усміхаюцца, кідаюцца насустрач і просяць аўтографы. Яна не адмаўляе нікому.

— З самага першага класа я любіла ўрокі фізкультуры. Бегала хутчэй за ўсіх. Калі вучылася ў пятым класе, да нас прыйшоў Паўлавіч (так Маша называе свайго першага трэнера Пятра Бабея). Мы разам з адной дзяўчынкай выпадкова пайшлі на барацьбу. Гэта была самая вялікая секцыя ў нашай Зябраўцы. Спачатку ўзнік такі ажыятаж і займацца прыйшло вельмі шмат народу, а праз тыдзень засталася я і некалькі хлопчыкаў. Да гэтага што толькі не цікавіла: і на разьбу па дрэве хадзіла, маляваць спрабавала, займалася шахматамі... Усюды была, а на барацьбе нейкім чынам засталася. Спачатку трэніроўкі былі толькі тры разы на тыдзень. Паўлавіч з намі праводзіў розныя новыя гульні. Да таго ж я з хлопчыкамі любіла гуляць, хоць і ў лялькі таксама. Трэнер нас нават шакаладкамі заахвочваў. Ён мяне і цяпер падтрымлівае. У мяне ж бацькі няма. Магчыма, ён мне даў тую бацькоўскую любоў, якой не хапала. І цяпер я для яго — як дачка.

***— Барацьба, здаецца, траўматычны від спорту?***

— Неяк абышлося ў дзяцінстве. Не памятаю асаблівых траўмаў. Толькі нейкія драпіны. Але ж гэта дзіцячы ўзрост, і ты на многае не звяртаеш увагу. На ровары катаешся, абдзярэш каленкі ці локці. Не зацыклiваешся на гэтым. Я ў школе магла пабіцца і з дзяўчынкамі, і з хлопчыкамі. Аднойчы прыйшла дадому з адарваным рукавом у курткі. Калі б не спорт, з маёй энергіяй можна было б трапіць не ў тую кампанію. Хоць матуля выхоўвала заўсёды правільна.



***— Напэўна, вы шмат разоў чулі, што займаецеся нежаночым відам спорту...***

— Маці год-паўтара была супраць: гэта ж толькі для хлочыкаў. Дый я спачатку ёй казала, што застаюся на дадатковыя заняткі ў школе, а сама бегла ў секцыю. А потым яна пагутарыла з трэнерам, і ён яе пераканаў. Сказаў: у вас такая добрая дзяўчынка, яна вельмі перспектыўная, упартая, з яе павінна нешта атрымацца. Пасля гэтай размовы маці змірылася. Яшчэ трэнер казаў, што я валявая. Я гэта чула, і мне таксама спадабалася такая ацэнка. Нічога сабе, думаю, я такая малайчына!

***— А ў дзяцінстве кім марылі быць?***

— Кім я толькі не марыла! Адзінае, што мне і цяпер падабаецца, — медыцына. Я, магчыма, хірургам паспрабавала б стаць. Але ж закончыла ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, факультэт фізвыхавання і засталася там у магістратуры. Буду спецыялістам па лячэбнай фізкультуры.

***— Марыя, калі адбылася вызначальная перамога, якая адназначна паказала, чаму прысвяціць жыццё?***

— Трэнер вазіў нас на розныя дзіцячыя спаборніцтвы. Памятаю, у нас былі абласныя прафсаюзныя спаборніцтвы і тады я выйграла ў дзяўчынкі, якая вучылася ў вучылішчы алімпійскага рэзерву. Гэта для мяне было прэстыжна, і значна, і дзівосна. Памятаю свой першы медаль на рэспубліцы. Такая радасць! А потым сама паступіла ў вучылішча алімпійскага рэзерву...

***— ...і шлях быў наканаваны...***

— Калі два гады займалася барацьбой, ужо нават думкі не прыходзілі, што можна прыпыніцца і заняцца нечым іншым. Барацьба і толькі барацьба. У вучылішчы алімпійскага рэзерву маім другім трэнерам стаў Георгій Джангіраў. Але там я адвучылася толькі адзін курс — потым здарылася сур'ёзная траўма калена. Тады я выбыла надоўга. Толькі праз 7-8 месяцаў трапіла зноў на дыван.

***— Ці быў у той час момант, калі здавалася, што ўсё, з вялікім спортам трэба завязваць?***

— Не. Мне зрабілі аперацыю, а потым быў доўгі перыяд аднаўлення калена. Трэба было распрацоўваць нагу. Было цяжка, але ж у мяне нават думак не было, каб спорт пакінуць. Калі паступіла завочна ва ўніверсітэт, тады ў Гомелі пачаў працаваць Сяргей Мікалаевіч Смаль. Ён мяне ўжо ведаў. Ён нават памятаў, як мяне з яшчэ адным хлопчыкам прывялі ў вучылішча алімпійскага рэзерву — мы былі маленькімі такімі карапузікамі. Потым я яго спытала: Мікалаевіч, будзеце са мной працаваць? Ён пагадзіўся, і мы цяпер з ім працуем. Мы разам дасягнулі такога выніку, і я вельмі ўдзячная яму за ўсё. Гэта яго вялікая заслуга.

***— Чым для вас запомнілася Алімпіяда ў Рыа-дэ-Жанэйра?***

— Мы былі амаль суткі ў дарозе: увогуле 12 гадзін у паветры, яшчэ 6 гадзін у аэрапорце чакалі перасадку на другі самалёт. Стаміліся. Калі ты «ганяеш вагу», у цябе няма асаблівa сіл і трэба эканоміць тую энергію, якая засталася да ўзважвання. 16-га раніцай прыляцелі, а 17-га ў нас узважванне. Да нашага прыезду падрыхтаваліся. Таму пакоі былі добрыя і нават кветкі стаялі — прыемна. Гэта тыя, хто першым прыехаў, пабачылі і пыл будаўнічы, і бруд. У працэсе спаборніцтваў было многа скаргаў, але потым быт спартсменаў наладзілі. На шчасце, беларусаў абышлі бокам непрыемныя прыгоды, якія здарыліся з іншымі. 18-га з раніцы мы ад'ехалі з гатэля і вярнуліся з залы толькі позна вечарам. Яшчэ пробу на допінг здавалі і на наступны дзень ад'ехалі. Таму горад я бачыла толькі з акна аўтобуса. У тым ліку фавэлы. Гэта такія трушчобы, дзе жывуць бедныя людзі.

***— Для спартсмена важныя і ўмовы, дзе праходзяць спаборніцтвы...***

— Яны былі нядрэнныя. Не супер, але дастаткова прыемныя. Чатыры размiначныя дываны, раздзявальні для кожнай краіны. Было дзе перакусіць. У трэніровачнай зале мелася 14 дываноў, дастаткова неабходных трэнажораў. Саўна з усім неабходным была. Праўда, без душа, і гэта мінус. Нам пашанцавала, што спартыўная арэна і трэніровачная зала знаходзіліся за 10 хвілін язды ад алімпійскай вёскі. Бо здараліся выпадкі, як з Аляксандрай Герасіменяй — калі кіроўцы не ведалі маршрутаў і не туды завозілі спартсменаў. Я ўжо ўсіх суперніц ведала, амаль з усімі даводзілася змагацца на іншых спаборніцтвах. Магчыма, толькі з дзвюма дзяўчатамі ніколі на дыване не сустракалася.

***— Каго бачылі сваімі асноўнымі саперніцамі?***

— У нас такі від спорту, што тых, у каго можна было б лёгка выйграць, няма ўвогуле. Кожны хоча цябе «парваць». Саперніка нельга недаацэньваць. Дзесьці расслабіўся і ўсё — цябе пакаралі. Казахстанская спартсменка Кацярына Ларыёнава ў першай схватцы мяне перавярнула так, што ледзь не палажыла. Я магла прайграць. У мяне ў галаве толькі было: так не можа ўсё закончыцца. Я сюды не дзеля гэтага прыехала. Гэта мне і дапамагло. Са шведкай Хеннай Юхансан змагалася — таксама ў яе выйграла. За выхад у фінал змагалася з амерыканкай Аленай Піражковай — я ёй раней прайгравала. Выйграла за кошт таго, што не спынялася і змагалася да канца. А фінал для мяне — пакуль балючая тэма.

***— Гэта тое, што, відаць, трэба аналізаваць на халодную галаву.***

— Калі з'явяцца здымкі спаборніцтваў у інтэрнэце, паглядзім, прааналізуем. Магчыма, тактычна яна лепш выглядала, чым я.

***— Якія якасці вашай саперніцы вы ацанілі ўжо зараз?***

— Яна была хутчэйшая, чым я. Толькі пачынаю да яе падбірацца, а яна апярэджвае мяне. Больш нічога.

***— І ўсё ж спадзяюся, што вы высока ацэньваеце і гэты свой медаль. Ну і ёсць да чаго надалей імкнуцца.***

— Гэты сярэбраны медаль мне гаворыць пра тое, што не трэба спыняцца. Трэба браць золата на наступнай алімпіядзе ў Токіа.

***— Ваша саперніца Рысака Каваі таксама там будзе.***

— Думаю, за наступныя чатыры гады мы з ёй не раз будзем сустракацца на спаборніцтвах. Магчыма, з'явяцца і іншыя моцныя спартсмены.

***— Маша, ці прыходзілася ў бытавых сітуацыях прымяняць свае навыкі барца?***

— Не, не прыходзілася. Напэўна, калі б трэба было, змагла б нешта зрабіць — нехта пацярпеў бы дакладна. Калі сутыкаюся з хамствам, тым жа манерам не адказваю. Трэба спакойна гаварыць з такім чалавекам. Напэўна, імкнуся не звяртаць увагу.

***— Вас вучылі нейкім псіхалагічным прыёмам пры рабоце з сапернікам?***

— Псіхалогія вельмі многа адыгрывае. У спорце важна ўсё. Не толькі тое, у якой ты фізічнай форме знаходзішся. Усё ад галавы ідзе. Як ты сябе настроіш, якія мэты маеш, так усё і будзе. І тады не мае значэння, хто выходзіць супраць цябе. Псіхолагі нам дапамагаюць, але ж галоўны псіхолаг для мяне — трэнер.

***— Якая матывацыя вас асабіста вяла да перамогі?***

— Канешне, ты хочаш сабе забяспечыць далейшае жыццё, хоць бы на пэўны перыяд часу. Хочаш, каб тваё імя працавала ўрэшце на цябе. Але ж у першую чаргу не гэта важна. Алімпійскія гульні для любога спартсмена — гэта найвышэйшая вяршыня, якую ён можа дасягнуць. Усе хочуць «золата». Гэта максімум з таго, што ты можаш зрабіць у спорце. Хоць, канешне, матэрыяльны бок важны. Тым больш што ў мяне няма свайго жылля. Зразумела, хачу прыходзіць дадому, а не ў інтэрнат. Таму, верагодна, для мяне ўсё важна ў сукупнасці. Ехала на Алімпіяду, каб дастойна выступіць, каб выйграць. Ехала па медаль.

***— Давайце пра наша, пра жаночае, пагаворым. У вашым гардэробе ёсць месца сукенкам?***

— Іх я надзяваю вельмі рэдка. Для мяне, каб надзець сукенку і абцасы, павінен быць нейкі асаблівы, значны дзень. У асноўным джынсы і сарочкі... Нават калі ты не на зборах, усё роўна дзве трэніроўкі ў дзень. І на іх не пойдзеш у сукенцы. Трэба надзяваць тое, што зручна.

***— Ці ёсць у вас любімая ежа?***

— Я ўсё ем. Мяса вельмі люблю, агародніну і садавіну таксама. Морапрадукты. Пасты ўсякія. Бліны маміны люблю. Увогуле ж не перабіраю.

***— Салодкае?***

— Салодкае вельмі люблю. Відаць, гэтак жа, як і мяса. Шакалад і марожанае люблю. Але ж трэба трымаць сябе ў форме, таму імкнуся кантраляваць. Пасля спаборніцтваў можна некалькі расслабіцца, а потым зноў нічога лішняга.

***— Многія мужчыны глядзяць на вас не толькі як на спартсменку, але і як на прывабную жанчыну. Як рэагуеце?***

— У мяне ёсць малады чалавек, ён таксама барэц. Мы даўно разам. Усё сур'ёзна. Можа, таму я не звяртаю ўвагі на мужчынскія погляды ў мой бок. Я проста іншых не заўважаю.

***— Паміж алімпіядамі не збіраецеся стварыць сям'ю і нарадзіць дзіця, як некаторыя нашы вядомыя спартсменкі?***

— Увогуле як Бог дасць. Каб планаваць... Пакуль, напэўна, не. У нашым відзе спорту як здароўе дазваляе, так і выступаюць жанчыны. Японкі, якія выступалі ў Рыа-дэ-Жанэйра — ім па 34—36 гадоў. У нас многа ўзроставых спартсменаў. Ты можаш доўга змагацца, але калі ў цябе пачынаюць выйграваць маладыя — гэта не вельмі прыемна.

***— Што, акрамя спорту, ёсць у вашым жыцці?***

— Асабліва часу няма, самі разумееце. Я маму бачу раз у месяц... Вольны час імкнуся ўдзяліць ёй, сябрам і крыху адпачыць. Паміж трэніроўкамі кніжкі чытаю. Зусім нядаўна на зборах прачытала «Жыццё ў пазыку» Рэмарка, «Да сустрэчы з табой» Джоджа Моеса, «Шантарам» Грэгары Дэвіда Робертса... Больш чытаю папяровыя кнігі, хоць ёсць і электронная. Люблю хадзіць у кіно, пасядзець у кавярні і нават проста «пабалбатаць» з сябрамі. З нядаўніх моцных уражанняў — грузінскі балет Сухішвілі. Я даўно хацела яго пабачыць, купіла ў інтэрнэце апошні квіток. Мне вельмі спадабалася — гэта вельмі крута! З задавальненнем хадзіла б кудысьці часцей. Напрыклад, у Гомельскі драматычны тэатр.

У гэтым месцы прэс-сакратар Гомельскага драматычнага тэатра Уладзімір Ступінскі, які паралельна рабіў фотаздымкі, уручыў Марыі запрашальныя білеты на дваіх на любыя спектаклі ў новым сезоне. Ну, а ў мяне засталося толькі адно пытанне.

***— Маша, у вас ёсць нейкае крэда?***

— Часта кажу сабе: бачу мэту — упэўнена ў поспеху.

***Наша славутая Маша МАМАШУК сёння, 31 жніўня, адзначае свой дзень нараджэння.*** *Асноўны падарунак да яго яна сабе ўжо зрабіла. Сярэбраны алімпійскі медаль насамрэч зроблены з серабра і важыць каля паўкілаграма. Мы нашай зорачцы жадаем упэўненасці, упартасці і хуткасці. А яшчэ шчырых усмешак родных людзей, якія яе падтрымаюць у любым выпадку!*



**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Пачатак восені стартуе са зніжак

**Гандлёвыя арганізацыі Мінска ў верасні правядуць для пакупнікоў акцыі «Дні зніжак» на нехарчовыя тавары, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Так, ААТ «ЦУМ Мінск» прапануе 10, 17 і 24 верасня пакупнікам зніжку ў 17 працэнтаў. Універмаг «Беларусь» зніжкай у 20 працэнтаў парадуе пакупнікоў 6, 13, 14, 20, 24 і 27 верасня. Такі ж прыемны бонус пры набыцці нехарчовых тавараў будзе дзейнічаць 15 і 29 верасня ў ГУМе. Таксама 20-працэнтная зніжка дазволіць сэканоміць 7, 14, 21 і 28 верасня пакупнікам у Гандлёвым доме «На Нямізе».

Выгадна будзе наведаць універмаг «Кірмаш» 3, 7, 14, 21 і 28 верасня, ТАА «Старт-Х» 7, 15 і 27 верасня, краму «1000 дробязяў» 1, 8, 15, 22 і 29 верасня: пакупкі ў гэтыя дні ў названых гандлёвых прадпрыемствах будуць каштаваць на 15 працэнтаў менш. Магазіны гандлёвага цэнтра «Сталіца» 10 і 24 верасня прапануюць зніжкі ад 5 да 50 працэнтаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## «ПЛУГАМІ ВЫРВАЛА ВЯЛІКІ КАВАЛАК КАБЕЛЮ. СУВЯЗЬ АДНОВЯЦЬ»

**З вёскі Кавальцы Дзяржынскага раёна звярнуліся крыху збянтэжаныя дачнікі: паводле іх слоў, недзе з мінулых серады-чацвярга не працуюць тэлефоны. Кажуць, быццам падчас палявых работ недзе плугамі пашкодзілі тэлефонны кабель.**

Як адзначылі самі заяўнікі, часовае знікненне сувязі з вонкавым светам — гэта, можна сказаць, для іх і не праблема. Цяпер жа ў кожнага мабільны тэлефон як мінімум. Іншая справа, што ўжо колькі дзён у мясцовай краме нельга было разлічыцца па банкаўскай картцы: тэрмінал там працуе ад тэлефоннай сувязі.

**Намеснік начальніка Дзяржынскага раённага вузла электрасувязі Аляксандр ЯКАЎЛЕЎ** адразу пацвердзіў: так, згаданая праблема маецца, над яе вырашэннем зараз працуюць спецыялісты. На момант, калі дачнікі і мясцовыя жыхары ў Кавальцах атрымаюць гэты нумар газеты, сувязь у іх ужо павінна быць адноўлена.

— Падчас правядзення сельскагаспадарчых работ на полі плугі моцна заглыбіліся і парвалі тэлефонны кабель. Апошні знаходзіцца на балансе мясцовай гаспадаркі. Пакуль шукалі месца парыву — а ён атрымаўся вялікім, недзе пад сто метраў, — вырашалі іншыя пытанні (кабель аплаціла гаспадарка, работы праводзіў раённы вузел электрасувязі), вось і прайшоў час, — распавёў Аляксандр Вячаслававіч. — Што тычыцца часовай праблемы з разлікамі па банкаўскай картцы, дык трэба памятаць — такія збоі, на жаль, раз-пораз бываюць і з іншых прычын.

Зрэшты, як дадаў далей суразмоўца, непасрэдна да іх нашы заяўнікі не звярталіся. Калі б хто з насельнікаў Кавальцоў меў патрэбу, у раённым вузле электрасувязі маглі б выдаць ахвотным у часовае карыстанне бесправадныя тэлефоны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Экалагічны лікбез

## НЯВЕДАННЕ НЕ ВЫЗВАЛЯЕ АД АДКАЗНАСЦІ

**Супрацоўнікі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь працягваюць на агульных прыкладах з жыцця тлумачыць недапушчальнасць паводзінаў грамадзян у тых ці іншых сітуацыях. Парушэнне правілаў, нават па няведанні, часам можа цягнуць за сабой сур'ёзныя наступствы, у тым ліку як адміністрацыйную, так і крымінальную адказнасць.**

### ЗНАЙШОЎ ТУШУ? НЕ ЧАПАЙ

***Што рабіць пры выяўленні параненай, хворай або загінулай дзікай капытнай жывёлы? Грамадзяне з падобным пытаннем звяртаюцца ў Дзяржаўную інспекцыю даволі часта. Разам з тым адказ на яго выразна выкладзены ў Правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання.***

Пунктам 148 Правілаў устаноўлена, што пры выяўленні ў паляўнічых угоддзях і (або) на тэрыторыях, не ўключаных у фонд паляўнічых угоддзяў, у тым ліку на дарогах, параненых, траўміраваных, хворых або загінулых дзікіх жывёл забараняецца самавольна здабываць, разбіраць або перамяшчаць (транспарціраваць) іх тушы або часткі туш, выкарыстоўваць прадукцыю (мяса, шкуру, рогі і іншае).

У выпадку выяўлення параненай, траўміраванай, хворай або загінулай паляўнічай жывёлы нарміруемых відаў (у тым ліку дзікай капытнай жывёлы) або дзікай жывёлы відаў, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, асоба, што выявіла такую жывёлу, павінна паведаміць карыстальніку паляўнічых угоддзяў, або ў аператыўна-дзяжурную службу тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, або ў дзяжурную службу раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, якія абавязаныя перадаць гэтае паведамленне службовай асобе карыстальніка паляўнічых угоддзяў або мясцовага выканаўчага і распарадчага органа.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы і карыстальнікі паляўнічых угоддзяў абавязаны прадставіць у тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў і раённыя аддзелы па надзвычайных сітуацыях кантактныя тэлефоны службовых асоб, упаўнаважаных прымаць рашэнне па арганізацыі выратавання або здабычы параненай, траўміраванай, хворай паляўнічай жывёлы.

Па факце выяўлення параненай, траўміраванай, хворай або загінулай паляўнічай жывёлы нарміруемых відаў службовая асоба карыстальніка паляўнічых угоддзяў, а ў фондзе запасу паляўнічых угоддзяў альбо на тэрыторыях, не ўключаных у фонд паляўнічых угоддзяў, — упаўнаважаная службовая асоба мясцовага выканаўчага і распарадчага органа з удзелам прадстаўнікоў арганізацыі Міністэрства лясной гаспадаркі і тэрытарыяльнага органа Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а таксама спецыяліста дзяржаўнай ветэрынарнай службы (калі жывёла хворая ці загінулая) складаюць акт, пасля чаго пры неабходнасці ў іх прысутнасці адбываецца здабыча параненай, траўміраванай або хворай паляўнічай жывёлы. Перамяшчэнне (транспарціроўка), разбор паляўнічых жывёл без наяўнасці акта, складзенага ў названых вышэй выпадках, забароненыя.



Звяртаем асаблівую ўвагу, што незаконныя (у тым ліку самавольныя) перамяшчэнне (транспарціроўка) або разбор дзікіх капытных жывёл, у тым ліку загінулых, або іх частак, з'яўляюцца крымінальна каральнымі дзеяннямі, адказнасць за здзяйсненне якіх устаноўлена часткамі 2, 3 артыкула 282-1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

### ДЗЕ ПРЫСТРАЛЯЦЬ ЗБРОЮ?

***Паляўнічы набыў новы карабін ці шротавыя патроны ад новага вытворцы. Дзе можна прыстраляць зброю і праверыць «кучнасць» боепрыпасаў?***

Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання (пункт 157) дазваляюць паляўнічым прыстрэльваць зброю ў працэсе палявання пры законным знаходжанні ва ўгоддзях, але толькі ў месцах з натуральнай агароджай (кар'еры, яры і іншае) ці ў месцах, якія добра праглядаюцца на ўсю дыстанцыю палёту кулі і (або) іншага снарада.

Таксама прыстрэлка зброі (незалежна ад наяўнасці ў паляўнічага паляўнічай пуцёўкі) можа адбывацца ў спецыяльна адведзеных для гэтай мэты месцах. Такія зоны павінны быць адведзены кожным карыстальнікам паляўнічых угоддзяў і вызначаны яго лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі. Да дакументаў прыкладаецца схема, на якой пазначаны межы тэрыторыі, адведзенай для прыстрэлкі, лінія і кірунак стральбы, месца ўстаноўкі мішэняў.

Гэтую ж схему карыстальнік паляўнічых угоддзяў абавязаны размясціць на інфармацыйным паказальніку, устаноўленым непасрэдна на месцы прыстрэлкі, і ў адпаведнасці з ёй абсталяваць тэрыторыю (паставіць шчыты для мацавання мішэняў, пазначыць лінію і кірунак стральбы на мясцовасці).

Зараджаць зброю дазваляецца толькі на лініі стральбы. Парушэнне правілаў бяспечнага абыходжання з агнястрэльнай зброяй падчас яго прыстрэлкі недапушчальна!

Прыстрэлка паляўнічай зброі ў спецыяльна адведзеных для гэтага месцах можа праводзіцца круглы год. Рухацца да такіх месцаў і назад паляўнічыя павінны з разраджанай зачахлёнай зброяй, а ў паляўнічых угоддзяў або месцах пражывання паляўнічых жывёл — яшчэ і па вызначаных карыстальнікамі паляўнічых угоддзях або райвыканкамамі дарогах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

## ФУТБОЛ ПАД БЕЛЫМІ КРЫЛАМІ

### Нацыянальная зборная рыхтуецца да адборачных матчаў чэмпіянату свету — 2018

**Сёння, у 20.30 па беларускім часе, наша каманда згуляе са зборнай Нарвегіі ў Осла. Гэтая гульня стане важнай часткай падрыхтоўкі футбалістаў да першага кваліфікацыйнага матча чэмпіянату свету 2018 года з Францыяй, які адбудзецца ў Барысаве 6 верасня.**

На маючыя адбыцца сустрэчы па выкліку **галоўнага трэнера зборнай Аляксандра ХАЦКЕВІЧА** прыбудуць 23 футбалісты. На жаль, ён не зможа разлічваць на некаторых вядучых гульцоў. Так, у складзе няма траўмаванага паўабаронцы Аляксандра Глеба і Антона Пуцілы.

— *Траўма Глеба дастаткова цяжкая, таму на Сашу не можам разлічваць. Вядома, узровень ёсць узровень. І тая форма, у якой знаходзіўся паўабаронца, дазваляе казаць, што гэтая страта для нашай каманды сапраўды сур'ёзная* — гаворыць Хацкевіч.

Што да Антона Пуцілы, то ў гульца доўгі час былі праблемы са спінай, а потым дапамагчы зборнай яму замінaлі сямейныя праблемы. Аляксандр Хацкевіч адзначыў, што не назірае ў гэтага спартсмена асаблівага жаданне гуляць за нацыянальную каманду, таму ён адсутнічае ў складзе. У матчы супраць нарвежцаў таксама мы не ўбачым Мікіту Корзуна, які ў гэты час будзе гуляць за маладзёжную зборную, але да матча з Францыяй малады футбаліст павінен папоўніць шэрагі галоўнай каманды краіны.

Настаўнік беларусаў адзначае, што гасцявы спарынг з нарвежцамі павінен дапамагчы нашым футбалістам аднавіць гульнявыя сувязі, бо каманда даўно не збіралася разам. Акрамя таго, гульня ў Осла стане галоўнай праверкай гатоўнасці да стартавага паядынку адборачнага турніру чэмпіянату свету — 2018 з віцэ-чэмпіёнамі Еўропы — французамі.

— *Пакуль перад намі не ставілі ніякіх задач на будучы адборачны цыкл. Яшчэ не сустракаліся з кіраўніцтвам. Канкрэтыка наступіць пасля матча з нарвежцамі: тады і будуць вызначаны пэўныя мэты,* — паведаміў галоўны трэнер.

Аляксандр Хацкевіч таксама сказаў, што вельмі разлічвае на падтрымку балельшчыкаў у маючай адбыцца сустрэчы са зборнай Францыі, якая ўваходзіць у лік лепшых каманд свету і заўсёды паказвае цікавы, захапляльны футбол.

Беларуская зборная ўпершыню выйдзе на дамашняе поле ў абсалютна новай гульнявой форме і пад новым брэндам — «Белыя крылы.» Адзенне для футбалістаў выканана ў стыльнай каляровай гаме і змяшчае беларускі арнамент.

— *Кожны сімвал арнаменту адпавядае нейкім паняццям: агонь, багацце, душа, вясна, жыццё, ураджай. У кожным паняцці ёсць свая філасофія. Чалавек, які надзявае майку з арнаментам, адухаўляецца з гэтай ідэяй. Я ўпэўнены, нават каманда будзе гуляць па-іншаму,* — адзначае **дырэктар Асацыяцыі беларускай федэрацыі футбола па маркетынгу Уладзімір БЕРАЖКОЎ.**

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

**ОАО «АСБ Беларусбанк» с 1 сентября 2016 года вводит новые срочные банковские вклады «Интернет-депозит – Тренд Отзывный» и «Интернет-депозит – Тренд Безотзывный»**

**Условия по вкладам:**
• открытие и управление вкладом, не посещая структурное подразделение банка,
• возможность пополнения в соответствии с договором банковского вклада,
• ежемесячная капитализация процентов,
• расходные операции – в пределах капитализированных процентов,
• ежемесячная выплата процентов и возврат вклада при наступлении срока производится путем перевода остатка денежных средств с начисленными процентами на банковскую платежную карточку.

Размер процентных ставок устанавливается в зависимости от вида, валюты и срока возврата вклада:
- по срочному отзывному банковскому вкладу **«Интернет-депозит – Тренд Отзывный»**:

| Срок хранения (возврата) вклада (в месяцах) | 1 | 3 | 6 | 9 | 12 | 18 | 23 |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| в белорусских рублях (% годовых) | 13 | 14 | 15 | 15,5 | – | – | – |
| в долларах США, евро (% годовых) | – | 1,6 | 1,9 | – | 2,7 | 2,8 | 3 |
| в российских рублях (% годовых) | – | 2,6 | 3,1 | – | 4,5 | 5,6 | 6,5 |

- по срочному безотзывному банковскому вкладу **«Интернет-депозит – Тренд Безотзывный»**:

| Срок хранения (возврата) вклада (в месяцах) | 1 | 3 | 6 | 9 | 12 | 18 | 23 |
| --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- | --- |
| в белорусских рублях (% годовых) | 14 | 16,1 | 17,1 | 19 | – | – | – |
| в долларах США, евро (% годовых) | – | 1,9 | 2,3 | – | 2,8 | 3,0 | 3,2 |
| в российских рублях (% годовых) | – | 5,1 | 5,6 | – | 7 | 8,1 | 9 |

Для открытия вклада необходимо иметь либо оформить дебетовую банковскую платежную карточку, обеспечивающую доступ к текущему счету, открытому в ОАО «АСБ Беларусбанк» в валюте, соответствующей валюте вклада.

Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов).

**Более подробную информацию о новых вкладах можно получить по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях ОАО «АСБ Беларусбанк».**

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует о прекращении с 01.09.2016 приема денежных средств на срочные отзывные банковские вклады «Интернет-депозит – Тренд», «Интернет-депозит – Презент» и сообщает об отзыве с 01.09.2016:
- публичной оферты на заключение договора срочного банковского вклада «Интернет-депозит – Презент», опубликованной в газете «Звязда» 25.04.2015;
- публичных оферт на заключение договора срочного банковского вклада «Интернет-депозит – Тренд», опубликованных в газете «Звязда» 29.04.2015, по вкладам со сроком хранения 3, 6, 12, 18, 24, 36 месяцев.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь.

ВСЕГДА РЯДОМ! Контакт-центр — 147 www.belarusbank.by

БЕЛАРУСБАНК

УНП 100325912 ОАО "АСБ Беларусбанк"